**УДК 1(476)(091)+141.30**

# ТЭМАТЫЗАЦЫЯ САЦЫЯЛЬНАГА АСПЕКТУ Ў БЕЛАРУСКАЙ РЭЛІГІЙНА-ФІЛАСОФСКАЙ ДУМЦЫ ХХ СТАГОДДЗЯ

***Г.І. КЛІМОВІЧ***
***(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)***

*Аналізуецца тэматыка ўвасаблення прынцыпаў і ўстановак філасофскай традыцыі Тамаша Аквінскага ў рэлігійна-філасофскай думцы такіх беларускіх аўтараў, як айцец Фабіян Абрантовіч, айцец Ян Тарасевіч, айцец Адам Станкевіч, айцец Леў Гарошка, айцец Чэслаў Сіповіч і айцец Пётр Татарыновіч. На прыкладзе дадзеных аўтараў разглядаюцца найважнейшыя прынцыпы сацыяльнага аспекту тамісцкай сістэмы: прынцып агульнага дабра і тэакрэацыяніскага генезісу ўлады. Звяртаецца ўвага на прысутнасць характэрных рыс неатамізкай традыцыі, а менавіта інспірыраванасць канцэпцыяй «інтэгральнага гуманізму» Жака Марітэна. На падставе параўнання беларускага матэрыялу з дадзенымі тыпамі неатамізму робіцца выснова аб своеасаблівасці беларускай традыцыі ў якасці пераходнага тыпу паміж арыстоцелеўскім і экзістэнцыяльным варыянтамі тамізму.*

**Уводзіны.** Тэматыка дзяржаўнага будаўніцтва, ідэалогіі, базісных каштоўнасцей соцыуму, узаемаадносін палітыкі і іншых сфер грамадства з’яўляецца адной з асноватворных у рэфлексіі філосафаў і грамадскіх дзеячоў ХХ стагоддзя. Мэта дадзенага даследавання – аналіз пазіцыі, прадстаўленай у творчасці беларускіх аўтараў разглядаемага перыяду. Трэба адзначыць, што памер артыкула не дазваляе ў поўнай меры прааналізаваць акрэсленую праблематыку на прыкладзе ўсіх прысутных у беларускай дзяржаве канфесій, таму агляд будзе абмежаваны каталіцкай – як адной з найменш даследаваных у гісторыка-філасофскім плане ў ХХ стагоддзя. У беларускай рэлігійна-філасофскай думцы прапанаваны аспект знайшоў адлюстраванне ў творчасці а. Фабіяна Абрантовіча, а. Яна Тарасевіча, а. Адама Станкевіча, а. Льва Гарошкі, а. Чэслава Сіповіча і а. Петра Татарыновіча.

Праблемнае поле дадзеных аўтараў закранае наступныя пытанні: генезіс улады, тэарэтычныя пытанні ўзаемаадносін светапогляду, рэлігіі, ідэалогіі і палітыкі; ідэал фундзіраванасці гістарычнай мэты грамадства тамісцкай катэгорыяй «агульнага дабра», ідэя ўсталявання тэакратычнай па зместу дзяржавы, заснаванай па форме на дэмакратычных каштоўнасцях, гісторыя развіцця заходнееўрапейскай цывілізацыі праз неатамісцкую прызму дыхатаміі антрапацэнтрычнага і тэацэнтрычнага гуманізму.

**Асноўная частка.** Цікавасць да сацыяльнага аспекту ў беларускай рэлігійна-філасофскай думцы ўзнікае разам са з’яўленнем пытання пра паходжанне ўлады. Дадзеная праблема была ўпершыню сфармуляваная а. Фабіянам Абрантовічам у працы «Чалавек», дзе ён, даючы характарыстыку грамадства, паміж іншым адзначае асноватворную ролю ўлады ў адносінах да грамадства, тэакрэацыяніcцкі характар яе паходжання:

«Грамадзкае жыццё ўносіць найважнейшы элемент: уладу. Ня можа быць грамадзкага жыцця без улады, як нармальнага арганізму людзкога без галавы. Праўдзівая, чыстая анархія – безуладзьзе – немагчыма. Формаў улады многа. Усе яны ідуць ад Бога ня ў тым сэнсе, што Бог безпасрэдна адным дае цара, а другім прэзідэнта, а трэцім Саветы, а ў тым, што Бог стварыў чалавека грамадзкім, што яму без улады не абыйсьціся, а якую мае меці – яго рэч; няхай прабуе, каторая лепшая, няхай выбірае, няхай нат выдумоўвае новыя формы ўлады, калі зможа. Сёньня развіты вельмі фальшывыя тэорыі грамадзкія, што крыніцай улады ёсьць народ. Гэта такая праўда, як сказаць, што прычынай сьвятла, ёсьць акно. Не! Прычынай святла (у дзень) ёсьць сонца, а вакно толькі варункам, каб святло даходзіла ў дом. Таксама што да ўлады. Прычынай ёсьць Бог, а народ толькі карытам, а не крыніцай» [1, с. 16].

Дадзенага тэакрэацыяніcцкага пункту гледжання на праблему генезісу ўлады прытрымліваецца і а. Адам Станкевіч, разглядаючы грамадства толькі як форму ўвасаблення ўлады, а змест пакідаючы за Абсалютам:

«Існуе на свеце ўрэшце і ўлада, якая кіруе жыццём грамадзкім людзей, якая ўкладае адносіны між людзьмі паасобнымі, а так-жа між грамадзкімі класамі, між народамі і дзяржавамі. І над гэтым жыццём Збаўца наш, як Бог-Чалавек, так-жа мае поўную ўладу. Людзі сёння любяць казаць, што грамадзка-палітычная ўлада паходзіць ад народу. Вось-жа ня гэтак. Улада гэта старэйшая і ад усякага народу і ад усякага чалавека. Ад народу паходзіць не самая ўлада, а толькі форма ўлады. І якая гэная ўлада ня была-б, калі хоча, каб яна людзям сапраўды карыснай была, аднолькава моц сваю мусяці браць ад Бога і аднолькава ўсе свае загады, свайго права мусяць апіраць на праве Бога і на Ягонай найвышэйшай уладзе» [2, с. 3].

Хрысціянскі ідэал як аснова грамадства, а Хрыстос, як крыніца ўсялякай улады знайшоў адлюстраванне ў разважаннях а. Ідэльфонса Бобіча. У рэфлексіі артыкуляваны прынцып падзялення ўлады на тры галіны, характэрны для дзяржаў дэмакратычнага напрамку:

«Бо Хрыстус, каторага вы лічыце толькі чалавекам, мае поўнасць улады над зямлёй і небам, а гэта значыцца, што Ён – Бог. Дык упадзі ж ніц, усё стварэнне, аддай паклон Хрыстусу, бо ён – Панам паноў і Каралём каралёў! Хрыстус мае ўсялякую ўладу. Улада можа быць трайная: адна пастанаўляе законы, другая кіруе жыццёвымі пастуткамі падданых. Трэццяя судзіць вінаватых. Усе гэтыя роды ўлады мае Хрыстус і мае без ніякага агранічэння» [3, с. 34].

У творчасці беларускіх аўтараў актыўна выкарыстоўваецца паняцце «агульнага дабра», характэрнага для тамісцкай традыцыі. Так, а. Баляслаў Пачобка ў працы «Чалавек на вышыні сваёй годнасці», прысвечанай этычнай праблематыцы, звяртаецца да катэгорыі «агульнага дабра», аналізуючы асноўныя маральныя якасці быцця чалавека, адзначае:

«Разбітнасьць бывае дваякая: так званая партыкулярная, каторая мае на мэце толькі нашую ўласную карысць і так называная камандаючая, маючая на мэце агульнае дабро. Першая радзіць нам, як маем паступаць, каб ні зыходзячы з дарогі цноты рабіць толькі тое, што толькі нам прынясці можа карысьць. Другая дбае аб дабро бліжніх, дык радзіць паступаць так, каб ні ў якім разе не сталася ім шкода, а напроці, каб ім рабіць дабро» [4, с. 16].

Да тамісцкай традыцыі выкарыстання катэгорыі «агульнага дабра» звяртаўся ў творчасці а. Леў Гарошка. Ідэя «агульнага дабра» выступае ў дадзенага аўтара прынцыпам і мэтай, якія аб'ядноўваюць індывідуальнасці ў адзінае грамадства. Так, у адным з артыкулаў аўтар вызначае яго ў якасці агульнай мэты, дзеля якой павінна ажыцця ўляцца праца кожнага чалавека:

«Як у жывым арганізму безнастванку пульсуе сэрца, як рэгулярна дыхаюць лёгкія, як сістэматычна працуюць іншыя ворганы жывога цела, як штодзенна ўсходзіць і заходзіць сонца, як штодзенна адчуваем патрэбу есьці, каб утрымаць жыцьцё – такім павінна быць і нашае дзеяньне ў грамадзкай працы, такою акуратнай і штодзеннай павінна быць наша малітва ўдзячанасьці Богу за ўсе Ягоныя дабрадзействы і такою-ж павінна быць малітва просьбы за лепшую будучыню народу. А штодзенную малітву павінна суправаджаць такая-ж штодзённая акуратная праца ў той дзелянцы жыцьця ў якой кожны з нас можа зрабіць нешта карыснае для *агульнага дабра* (курсіў – *аўтара*)» [5, с. 2].

У іншым варыянце дадзенае паняцце выступае агульнай мэтай рэлігіі і палітыкі:

«Для добрых суадносінаў паміж рэлігіяю і палітыкаю можа шмат прычыніцца агульнае ўсьведамленьне датычна сутнасьці гэтых суадносінаў. У шмат якіх дачыненьнях магчыма адзьдзяліць Царкву ад дзяржавы з карысьцю для абедзьвех гэтых установаў, але нельга зусім разьмежаваць палітыкі і рэлігіі, як нельга падзяліць жывога чалавека, бо і палітыка, і рэлігія, маючы розныя апошнія мэты, маюць тую самую дачасную мэту, якою ёсьць агульнае грамадзкае дабро, або інакш кажучы, дабро чалавека. А гэтае дабро можна асягнуць дзеючы толькі згодна з агульным сусветным парадкам. Бо і сусьветам і паасобным чалавекам кіруе тая самая Рука» [6, с. 2].

Трэба адзначыць, што дадзеныя прынцыпы тэакрэацыянісцкага варыянту паходжання ўлады і прынцыпа «агульнага дабра» сведчаць аб пэўным уплыве арыстоцелеўскага тыпу тамізму на беларускую рэлігійна-філасофскую думку. У той жа час нельга абмінуць наяўнасць і непасрэдна неатамісцкай традыцыі, прадстаўленай у аналізе развіцця гісторыі заходнееўрапейскай цывілізацыі ад часоў Адраджэння да сучаснасці. Відавочна, што беларуская традыцыя адчула ўплыў канцэпцыі «інтэгральнага гуманізму» Жака Марітэна. Так французскі мысліцель адзначае:

«Крах сярэднявечча адчыняе такім чынам дзверы новаму гуманізму. Велічнае разлажэнне сярэдніх вякоў і іх сакральных формаў ёсць з'яўленне "свецкай" цывілізацыі – ня проста свецкай, але такой, якая ўсё далей і далей адыходзіць ад Увасаблення. Гэта ўсё яшчэ, калі хочаце, стагоддзе Сына чалавечага, але чалавек пераходзіць ад культа Чалавека-Бога, культа Слова, якое стварыла чалавека, да культу Чалавецтва, чыстага чалавека.

Характарызуючы найбольш каротка дух гэтай эпохі, дух эпохі, якая накіроўвалася гуманістычным Рэнесансам і Рэфармацыяй, скажам, што яна хацела прыступіць к антрапацэнтрычнаму апраўданню створанай істоты, адчуваннем сімвалу якога, калі б шукаць яго ў супадзенні рэлігійнай архітэктуры і становішчам душы, магло б стаць знакамітае барока» [7, с. 62].

Водгукі поглядаў Жака Марітэна прысутнічаюць у шэрагу артыкулаў беларускіх аўтараў, такіх як а. Леў Гарошка, а. Пётр Татарыновіч, Казімір Рог.

Так, Казімір Рог у нарысе «Загад часу» робіць агляд развіцця заходнееўрапейскай філасофскай думкі ад часоў Адраджэння да сучаснасці; трэба адзначыць, што логіка яго рэфлексіі цалкам нагадвае канцэпцыю Жака Марітэна. Напрыклад:

«У XV веку прыходзіць час т. зв. рэнэсансу – адраджэньня. Гэта час, калі пасьля ўпадку Візантыі ў Эўропе сталіся ведамымі творы старое грэцкае культуры і ажыло зацікаўленьне ею, яе вяршком мас-

тацкае красы. У будаўніцтве зьнікаюць стралістыя будовы, іх замяняюць клясычныя грэцкія і рымскія найпрыгажэйшыя будынкі, але поруч іх зьяўляюцца раскошныя палацы, ратушы і інш. Чалавек пачынае ўзмоцненыя пошукі красы на зямлі, але і далей, як калісь мае цьвёрдую волю, гэтаю красою славіць Бога. Сьвятыні далей астаюцца, якія мала розьняцца ад сьвятыняў. У мастацтве зьяўляецца вольная кампазіцыя; постаці сьвятых ажываюць і моцна падчыркваюцца іхныя людзкія рысы. Распачынаюцца пошукі земскіх вартасьцяў» [8, с. 2]. Так характарызуе аўтар час Адраджэння, адзначаючы паварот ад Бога да чалавека, артыкуляваны ў працы «Інтэгральны гуманізм» Жакам Марітэнам.

Падобным чынам разважае і а. Чэслаў Сіповіч, разглядаючы гісторыю развіцця філасофскай думкі ў Заходняй Еўропе ад часоў сярэднявечча. Зноў жа ў згоднасці з поглядамі Жака Марітэна часы сярэднявечча ў дадзенага аўтара рэпрэзентаваны ў якасці грамадства хрысціянскіх каштоўнасцей:

«Эўрапейская культура паўстала з даўня культуры грэка-рымскай і хрысьціянства. Сынтэза была магчымая, бо ў шмат чым меліся супольныя звёны: абодзва дзейнікі прызнавалі дуалізм рэчаіснасьці, прымат духа, залежнасьці чалавека ад Абсалюту. Ня дзіва тады, што айцы Царквы захопліваліся грэцкімі філосафамі, ў асаблівасьці Платонам і Арыстоцелем. Сьв. Тамаш Аквінскі, гэній хрысьціянскай і тэолёгічнай думкі, тварэц сінтэзы хрысьціянскага сьветапагляду, Дантэ – гэній хрысьціянскай красы – падпарадкоўваюць у строгіх вывадах жыцьцё дачаснае мэтам жыцьця вечнага, мараль прасоўваюць ад Бога і рэлігіі. Такая лінія нефальшывае ортодоксіі на працягу стагодзьзяў зьяўляецца фундамэнтам грамадзкага і дзяржаўнага ладу. Права, палітычныя і грамадзкія ўстановы, зносіны адзінак як і дзяржаваў датарноўваліся да этычных нормаў» [9, с. 6].

Негатыўная адзнака часоў Адраджэння сустракаецца ў а. Чэслава Сіповіча зноў:

«Рэвалюцыя думкі пачалася так званым Адраджэньнем. Адраджэньне звярнулася да ідэалаў перасьпеўшага паганства. Яно славіць дачаснае жыцьцё, ідзе наперакор хрысьціянскім цнотам пакоры і скромнасьці. Ідэаламі гуманістаў зьўляюцца: веда, сільныя эмоцыйныя перажываньні, вера ў свае сілы. Ад часоў Адраджэньня заўважаем у навуцы суб'ектывізм, у праве – макіявелізм, у гаспадарчай працы – капіталізм» [9, с. 6].

У адпаведнасці з ідэалістычнай традыцыяй XX стагоддзя негатыўна пазіцыяніруецца рацыяналізм. Вось як падае дадзены аспект а. Чэслаў Сіповіч:

«XVIII стагодзьдзе – часы дэізму і рацыяналізму. Бога прызнаюць як абстракцыю, абыякавага да зямных справаў. Розум чалавека прызнаецца найвышэйшаю мераю праўды. Бажышчам філязофаў тагачаснае Нямеччыны зьяўляецца Эмануіл Кант з Каралеўца. Паводля яго чалавек мае магчымасьці пазнаць фэномэн – зьявішча, але ніколі сутнасьць рэчы; Бога розумам не пазнаеш, Яго існаваньне вымагаецца чалавекам; рэлігія мае выключна рэлятыўнае значэньне…» [9, с. 6].

Падобнае меркаванне прысутнічае і ў працах а. Льва Гарошкі. Так, у нарысы «Дух часу» аўтар адмоўна ставіцца да тых грамадскіх трансфармацый, што былі следствам з'яўлення рацыяналізму:

«Ад вякоў людзі ведалі свае слабасьці і вялі барацьбу з сваімі дрэннымі нахіламі, каб ня стацца іхнымі нявольнікамі, але вось ад XVIII стагоддзя на дапамогу дрэнным нахілам прыйшоў бязбожны рух так званых рацыяналістаў, які абвясьціў, што гэта нягуманна апаноўваць свае нізкія гоны – трэба даць ім волю. Хутка той рух прыняў арганізаваную форму вальнадумства. У тайных і яўных арганізацыях ён хутка так пашыраўся ў кіруючых кругох, што пачаў надаваць агульны тон грамадзкай думцы ў Заходняй Эўропе і пачаў плянаваць апанаваньне ўсяго свету» [10, с. 2].

Працягваючы далейшае параўнанне беларускай рэлігійна-філасофскай думкі і канцэпцыі Жака Марітэна, трэба адзначыць, што апошняя ўмоўна складаецца з дзвюх частак: першая – негатыўная – прысвечаная крытыцы антрапацэнтрычнага гуманізму; другая – пазітыўная – распрацоўцы паняцця «інтэгральнага гуманізму», шляхоў увасаблення яго ў жыццё. Аўтар вылучае асноўныя напрамкі працы хрысціяніна ў соцыуме:

1) неабходнасць універсальнай філасофіі, абумоўленай канкрэтнымі практычнымі вынікамі;

2) абнаўленне сацыяльнага парадку павінна быць звязана з абнаўленнем парадку духоўнага;

3) патрабаванне вырашэння праблем сацыяльнай і палітычных сфер.

Жак Марітэн адзначае, што дадзены вектар ужо тэарэтычна ўвасоблены ў энцыкліках рымскіх пап [7, с. 130, 131].

Блізкай па духу ў беларускай рэлігійна-філасофскай думцы з'яўляецца артыкул Вітаўта Зьніча «За хрысьціянскае сужыцце народаў», дзе паміж іншым ён адзначае:

«Будучыня Эўропы, сужыцьцё эўропейскіх народаў павінна апірацца выключна і толькі на прынцыпах справядлівасьці для кожнага народу. Цэмэнтам згоднага і добрасуседзкага сужыцьця горка-дасведчаных народаў Эўропы могуць быць толькі забавязываючыя ўсіх людзей хрысьціянскія прынцыпы маральнасьці і этыкі» [11, с. 8].

У адпаведнасці з пазітыўнай часткай можна ўзгадаць працу а. Петра Татарыновіча «Сацыялагічныя зацемкі», у якой разглядаецца развіццё наступных сацыяльных форм: сям'я, нацыя і задзіночанне на-

цый. Прынцыпам аб'яднання дзяржаў, на думку дадзенага аўтара, павінна быць фундзіраванасць хрысціянскімі маральна-этычнымі каштоўнасцямі:

«Таму над народамі і над дзяржавамі мусіць быць рэлігія. Але ня ў тым сэнсе, каб духоўная клерыкальная ўлада сама станавілася на чале дзяржаваў замест свецкага ўраду. Не! У хрысціянскай дзяржаве рэлігія мае абсяг сваіх беспасярэдніх заінтэрэсаваньняў і дзейнасьці да галіны ўзгадаваньня, пашырэньня і ўглыбленьня Хрыстовае навукі, каб гэткім спосабам уфармаць маральна-ўзгадваўчую псіхіку народаў і дзяржаваў» [12, с. 9].

**Заключэнне.** Падагульняючы вышэйнапісанае, трэба адзначыць, што сацыяльны аспект беларускай рэлігійна-філасофскай думкі сфармаваўся пад моцным уплывам таміцскай традыцыі. Адначасова падкрэслім, што на рысы яго фармавання паўплывалі як класічная тамісцкая традыцыя, так і неасхаластычны рух, што прывяло да з'яўлення пэўных асаблівасцей у сацыяльным аспекце – беларускага варыянту як пераходнага паміж арыстоцелеўскім і экзістэнцыяльным (да якіх можна далучыць Жака Марітэна) тыпамі.

ЛІТАРАТУРА

1. Абрантовіч, Ф. Чалавек / Ф. Абрантовіч. – Вільно, 1928. – 16 с.
2. Станкевіч, А. Божае Слова на ўрачыстаць св. Троіцы / А. Станкевіч // Хрысціянская думка. – 1934. – № 5. – С. 2 – 3.
3. Бобіч, І. Нядзелішнія Евангеллі і навукі / І. Бобіч. – Вільно, 1924. – 74 с.
4. Пачобка, Б. Чалавек на вышыні сваёй годнасці / Б. Пачобка. – Вільно, 1915. – 85 с.
5. Гарошка, Л. Аб саламяным агню і вытрваласці / Л. Гарошка // Божым шляхам. – 1953. – № 56. – С. 1 – 2.
6. Гарошка, Л. Палітыка і рэлігія / Л. Гарошка // Божым шляхам. – 1951. – № 58. – С. 1 – 2.
7. Маритен, Ж. Философ в мире / Ж. Маритен. – М.: Высш. шк., 1994. – 192 с.
8. Рог, К. Загад часу / К. Рог // Божым шляхам. – 1951. – № 3. – С. 1 – 3.
9. Сіповіч, Ч. Часы Хрыста і нашыя / Ч. Сіповіч // Божым шляхам – 1948. – № 11 – 12. – С. 4 – 6.
10. Гарошка, Л. Дух часу / Л. Гарошка // Божым шляхам. – 1954. – № 60. – С. 1 – 2.
11. Зьніч, В. За хрысьціянскае сужыцьцё народаў / В. Зьніч // Божым шляхам. – 1953. – № 55 – С. 6 – 9.
12. Татарыновіч, П. Сацыялягічныя зацемкі / П. Татарыновіч // Божым шляхам. – 1948. – № 4. – С. 9 – 11

*Паступіў 20.04.2012*

## THEMING OF THE SOCIAL ASPECT OF THE BELARUSIAN RELIGIOUS AND PHILOSOPHICAL THOUGHT IN THE XX CENTURY

***H. KLIMOVICH***

*The article is devoted to the review of the main principles thomistic philosophy in the social aspect of the intellectual heritage of the Belarusian religious writers f. Fabian Abrantovich, f. Adam Stankevich, f. Piotr Tatarynovich, f. Cheslav Sipovich, f. Lev Goroshko. It deals with the most important principle of the thomistic social thought – the concept of common good, the neothomistic concept of integral humanism. Comparing the factual material, author came to the conclusion of the inspiration Belarusian thought by two variants of the thomistic tradition – Aristotelian (the concept of the common good, theocratic version of the power's genesis) and existential (the concept of the integral humanism).*